
ISSN 1993-3606
Музычнае
і тэатральнае
мастацтва:
праблемы выкладання
4 2010
позитории

# Нацыянальны фальклор у сучаснай сістэме музычнай адукацыі



*У артыкуле разглядаецца агульнапедагагічная праблема вызначэння месца фальклору ў сучаснай сістэме музычна-эстэтычнай адукацыі.*

*Абапіраючыся на шэраг тэарэтычных і эксперыментальных работ айчынных і замежных вучоных, а таксама на выніку ўласнай навукова-практычнай дзейнасці, аўтар публікацыі прапануе для выкарыстання ў навучальным працэсе найбольш эфектыўныя метады і формы вывучэння твораў народнай спадчыны з мэтай пашырэння аб'ёму фальклорнага матэрыялу і павышэння якасці навучання сродкамі народнай песнятворчасці.*

*The article discusses about general educational problem of definition folklore's place in musical and esthetic education.*

*As a result of analysis of several theoretical and experimental research works by domestic and international scientists, and take into consider author's own practical results, she suggests the most effective methods and forms of introduction folklore material in educational process for the purpose improvement the quality and increase the volume introduced to students compositions of folk music.*

**Ключавыя словы і панянцці:** дзіцячая песнятворчасць, сінкрэтызм фальклору, вусная традыцыя перадачы матэрыялу, гульнявыя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці, комплексны падыход, творчыя віды дзейнасці.



**ЖАГУЛА Таццяна Уладзіміраўна** – выкладчык кафедры народных інструментаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, магістр педагагічных навук

Важная ва ўсе часы задача фарміравання творчай, духоўна багатай і высокаадукаванай асобы не страціла сваёй актуальнасці і сёння. Фальклор прадстаўляе сабой сістэму ідэальных метадаў мастацкага і педагагічнага падыходаў да дзіцяці. Паказальнымі прыкладамі выкарыстання фальклору ў навучальным працэсе з'яўляюцца сістэмы адукацыі, створаныя на аснове

народнай музыкі аўстрыйскім кампазітарам і педагогам К. Орфам, венгерскім педагогам З. Кодаі, японскім скрыпачом і педагогам С. Судзукі. Гэтыя методыкі былі распаўсюджаны ў многіх краінах свету, але найбольш эфектыўна сістэма З. Кодаі выкарыстоўваецца ў Венгрыі, а К. Орфа — у Аўстрыі.

Сярод беларускіх збіральнікаў і даследчыкаў дзіцячага фальклору першыя спробы музычнага развіцця малодшых школьнікаў менавіта сродкамі беларускай народнай песні можна знайсці ў А. Грыневіча. Ён стварыў праграму «Навука спеву» для пачатковага навучання дзяцей музыцы, якая грунтавалася на нацыянальным фальклоры, а таксама зборнікі з падрабязнымі метадычнымі каментарыямі «Школьны спеўнік» (Вільня, 1912) і «Дзіцячы спеўнік» (Вільня, 1925). Ва ўводзінах да выдання аўтар вызначыў галоўную мэту сваіх намаганняў: «...даць магчымасць грамадзянству, праз адпаведны навучнік, без вялікага высілку пазнаць і выкарыстаць у поўнай меры сваю народную песню, каторая пры бліжэйшым разглядзе мае поўнае права займаць роўнае месца сярод песняў другіх народаў...» [3, с. 3]. Па сутнасці, працы А. Грыневіча з'яўляюцца першымі спробамі злучыць музычную фалькларыстыку з педагогікай, але на практыцы вышэйадзначаныя работы не знайшлі адпаведнага прымянення.

Вялікую ўвагу ў сваёй педагагічнай рабоце надавала беларускім казкам і песням вядомы культурны дзеяч і настаўніца У. Ф. Луцэвіч. Яна збірала, запісвала і апрацоўвала фальклорны матэрыял для таго, каб потым выкарыстоўваць творы народнай спадчыны на занятках з малымі дзецьмі і вучнямі малодшых класаў.

На сучасным этапе айчынныя фалькларысты і педагогі-музыканты (А. М. Аляхновіч, Г. А. Барташэвіч, М. А. Баяровіч, І. М. Грамовіч, А. Ю. Лозка, А. У. Рашчынскі, В. М. Яшчанка і інш.) займаюцца пошукам найбольш эфектыўных форм і метадаў мэтанакіраванага вывучэння дзецьмі фальклору як у адведзены школьнымі праграмамі час, так і ў пазакласнай рабоце. Адной з цікавых прац апошніх гадоў, якая накіравана на ўкараненне ў вучэбны працэс агульнаадукацыйных школ беларускай нацыянальнай народна-песеннай спадчыны, з'яўляецца дапаможнік «Народная песня ў школе» А. М. Аляхновіча.

Актыўную работу па выкарыстанні ў навучальным працэсе беларускіх народных твораў праводзіць кафедра народных інструментаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Загадчык кафедры дацэнт А. І. Кавалёў і дацэнт В. М. Яшчанка распрацавалі вучэбны дапаможнік «Народная музычная творчасць: беларускія народныя песні». Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі М. В. Сірата ставарае арыгінальныя апрацоўкі народных песень і танцаў, разлічаныя на ансамблі і хоры розных узроўняў выканальніцкага майстэрства. Сумесна з народным ансамблем беларускай песні і музыкі «Ярыца», музычным кіраўніком якога ён з'яўляецца, М. В. Сірата плённа працуе над развіццём і папулярызацыяй беларускай народна-песеннай спадчыны не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Творчыя праграмы калектыву, апублікаваныя ў аўтарскіх зборніках «Дзе мы хадзілі, дзе гулялі», «Інструментальныя творы для ансамбляў народных інструментаў у апрацоўцы М. Сіраты», карыстаюцца папулярнасцю сярод выканаўцаў. Як хормайстар і педагог, Мікалай Васільевіч звяртае асаблівую ўвагу на тое, што ў рабоце з малодшымі ўзроставымі групамі больш шырокага прымянення заслугоўваюць абрадавыя (вяснянкі, калядкі), жартоўныя, прывітальныя і карагодныя песні.

Распрацаваныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь вучэбныя праграмы па прадметах музычна-эстэтычнага цыкла для агульнаадукацыйных устаноў краіны даюць выкладчыкам мноства магчымасцей у падборы мастацкага рэпертуару, планаванні зместу кожнага ўрока, выбары форм і метадаў правядзення заняткаў. Але, як паказвае практыка, настаўнікі выкарыстоўваюць абмежаваную колькасць фальклорных твораў з-за адсутнасці асабістага вопыту работы з народна-песеннай спадчынай, недасканалага ведання методыкі і тэорыі навучання сродкамі фальклору, недастатковай распрацоўкі навукова-метадычнай базы, недахопу якасных дапаможнікаў для педагогаў. Найкаштоўнейшыя педагагічныя і выхаваўчыя якасці народнай песнятворчасці неабходна выкарыстоўваць у навучальным працэсе па наступных прычынах:

1) мастацкія сродкі дзіцячай песнятворчасці вызначаюцца вытанчанасцю і прастатой, што спрыяе даступнасці іх успрымання і

выкарыстання вучнямі. Па слушным сцвярджэнні В. І. Ялатава, «...тут мы маем справу як бы з першапачатковым слоўнікам мастацтва» [7, с. 3]. Як паказвае практыка, інтанацыйная пабудова мелодыі цесна звязана з узроставымі магчымасцямі і асаблівасцямі дзіцячага галасавога апарату. Невялікі дыяпазон дзіцячых песень дае магчымасць настаўніку крок за крокам, паступова ўскладняючы матэрыял, удасканальваць пеўчыя навыкі вучняў;

2) метрарытміка дзіцячых песень, дражнілак, забаўлянак параўнальна простая. «Гэта пераважна двухдольныя метры з яснай акцэнтыроўкай і, як правіла, харэічнымі рытмаматывамі. Харэічнасць матываў, — заўважае В. І. Ялатаў, — падкрэслівае выразнасць і заканамернасць моўных акцэнтаў...», у выніку чаго рытмічная пульсацыя аказваецца цесна звязанай са словам [7, с. 39];

3) сінкрэтызм фальклору дае магчымасць: а) настаўніку больш свабодна выкарыстоўваць на ўроку розныя формы і віды работы (музычна-рытмічныя рухі, танец, гульню і г. д.); б) кожнаму вучню праяўляць свае творчыя памкненні ў абраных ім самім відах дзейнасці; в) на даволі высокім эмацыянальным узроўні засвойваць музычныя веды, набываць уменні і навыкі.

Аднак арганізацыя адукацыйнага працэсу з прымяненнем фальклору патрабуе ад настаўніка дасканалага ведання этнічнага матэрыялу, высокага прафесійнага майстэрства. На занятках абавязкова павінны захоўвацца і агульнадыдактычныя прынцыпы працэсу навучання: паслядоўнасць, даступнасць, сістэматычнасць, нагляднасць.

У малодшых школьнікаў пераважае неадвольнае запамінанне, таму асаблівую значнасць набывае прынцып нагляднасці, прэвалюе тэмбравае ўспрыняцце вышыні гуку, — вельмі карысна на першапачатковым этапе работы выкарыстоўваць вусную традыцыю перадачы матэрыялу. Метад пераймання даказвае сваю эфектыўнасць пры ўвядзенні ў навучальны працэс ігры на простых, лепш шумавых, музычных інструментах. У гэтым выпадку практычная дзейнасць або паказ дазваляе адначасова актывізаваць у вучня два аналізатары — зрок і слых. Такі метад работы станоўча ўплывае на творчае развіццё асобы школьніка, прымушае яго працаваць ва ўмовах адкрыцця новага спосабу дзеяння, «...забяспечвае пастаяннае напружанне музычнага мыслення, павышае гатоўнасць і ўспрымальнасць слыхавога апарату, ператварае веды ў практычныя ўменні, усеагульную “вусную” музычную граматнасць» [6, с. 88].

Вядома, што школьнікі 6—7 гадоў з вялікім задавальненнем атрымліваюць веды праз гульнявыя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці. Гэтай жа патрэбай у забаве абумоўлены і гульнявы пачатак амаль усіх жанраў дзіцячага фальклору. Калі той ці іншы жанр не прадугледжвае гульнявых дзеянняў, гульня ідзе на ўзроўні сэнсу, слова, гуку. Таму на ўроках музыкі, звязаных з вывучэннем фальклору, настаўнікам трэба больш увагі надаваць стварэнню гульнявых сітуацый. Агульнавядомы факт, што ў добра арганізаванай і спланаванай гульні навучальная і выхаваўчая дзейнасць педагога дасягае найбольшай эфектыўнасці, дзеці з лёгкасцю авалодваюць шматлікімі складанымі паняццямі, у тым ліку і музычнымі.

Адметнай якасцю фальклору з’яўляецца яго варыятыўнасць, якая дазваляе малодшым школьнікам без вялікіх намаганняў ствараць творчыя мініяцюры на аснове народных песенак, лічылак, забаўлянак, калыханак. Шлях уласнай творчасці прываблівае дзяцей, бо не скоўвае іх строгімі рамкамі.

Як паказвае практыка, пры вывучэнні фальклорных твораў трэба абавязкова забяспечваць комплексны падыход да арганізацыі пазнавальнай дзейнасці на ўроку, які прадугледжвае:

— вывучэнне тэарэтычных асноў музычнага мастацтва;

— прымяненне розных відаў дзейнасці: слуханне музыкі, выкананне твораў (спевы, музычна-рытмічныя рухі, ігра на музычных інструментах);

— далучэнне да творчых відаў дзейнасці: імправізацыі, вар’іравання і стварэння мелодый, тэкстаў, прыдумвання рухаў.

Комплексны падыход дазваляе развіваць музычныя здольнасці дзяцей у даступнай, цікавай форме, творча асвойваць дыдактычны матэрыял.

Вышэйсказанае пацвярджае мэтазгоднасць шырокага выкарыстання нацыянальнага фальклору ў сучаснай сістэме музычна-эстэтычнага навучання, бо на ўзорах песеннага мастацтва можна не толькі паспяхова развіваць музычна-творчыя здольнасці, фарміраваць мастацкі

густ і эстэтычныя пачуцці, але і выхоўваць такія маральныя якасці чалавека, як патрыятызм і любоў да сваёй краіны. На гэту акалічнасць звяртаў увагу В. Р. Бялінскі, калі заклікаў знаёміць дзяцей з творамі фальклору. «Агульнае праяўляецца толькі ў прыватным: хто не належыць сваёй радзіме, той не належыць і чалавецтву» [1, с. 5]. Сапраўдны грамадзянін сваёй краіны павінен ведаць і разумець гісторыю і культуру сваёй Бацькаўшчыны.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Барташэвіч, Г. А.* Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г. А. Барташэвіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1976. — 166 с.
2. Белорусская этномузыкология: Очерки истории / под ред. З. Можейко. — Минск : Тэхналогія, 1997. — 254 с.
3. *Грыневіч, А.* Навука сьпеву / А. Грыневіч. — Вільня, 1925. — 31 с.
4. Детская психология : учеб. пособие / Я. Л. Коломинский, Е. А. Панько, А. Н. Белоус [и др.]. — Минск : Университетское, 1988. — 399 с.
5. *Куприянова, Л. Л.* Формирование исполнительско-творческой деятельности детей, осваивающих песенный фольклор / Л. Л. Куприянова // Музыкальное воспитание в школе. — М. : Музыка, 1986. — Вып. 17. — С. 25—32.
6. *Фомин, В. П.* О значении устной традиции обучения музыке в формировании культуры музыкального восприятия и мышления / В. П. Фомин // Развитие музыкального слуха, певческого голоса и музыкально-творческих способностей учащихся общеобразовательной школы : сб. тезисов 6-й науч. конф. — М. : Науч. исслед. ин-т худ. воспитания, 1982. — С. 86—89.
7. *Ялатаў, В. І.* Дзіцячая песня // Дзіцячы фальклор / пад рэд. К. П. Кабашнікава. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972. — С. 34—58.


РЕПОЗИТОРИЙ